ПАДЗЕЯ

Гродненский государственный университет имени Янки Купалы

# «ЛІТАРАТУРНЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ»: КУРС НА ЗБЛІЖЭННЕ

**Чарговая сустрэча з цыкла «Літаратурныя ўніверсітэты» з удзелам дэлегацыі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі 20 лістапада адбылася на філалагічным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Ініцыятар доўгатэрміновага адукацыйна-асветніцкага праекта кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, член СПБ Аліна Сабуць.**

На працягу некалькіх гадоў дзякуючы Аліне Эдмундаўне студэнты-філолагі маюць магчымасць папоўніць свае веды аб сучаснай літаратуры роднага краю, у прыватнасці Гродзеншчыны на прыкладзе творчасці ўжо некалькіх нашых калег па пісьменніцкай арганізацыі, пазнаёміцца з яе дзейнасцю, атрымаць запрашэнне да супрацоўніцтва і сяброўства. Мінулая сустрэча ў межах праекта датуецца 17-м красавіка 2023 года, калі група гродзенскіх пісьменнікаў выступіла на факультэце журналістыкі. Нагадаем, па выніках сустрэчы моладзь напісала цэлы зборнік водгукаў-рэфлексій на творчасць і вобразы некаторых сучасных літаратараў Прынёманскага краю. Дзякуй вялікі студэнтам і выкладчыку!

Тым разам да першакурснікаў філфака (спецыяльнасці «Беларуская філалогія», «Рамана-германская філалогія») завіталі старшыня ГрАА СПБ, паэтэса, празаік Людміла Кебіч; паэт, публіцыст, блогер Анатоль Апанасевіч; лаўрэат IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), паэтэса Кацярына Каламійцава; паэтэса Людміла Шаўчэнка; паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. У ходзе заняткаў па дысцыпліне «Уводзіны ў літаратуразнаўства» (агляд раздзелаў «Эстэтыка літаратуры», «Паэтыка») закраналіся надзвычай істотныя пытанні як для майстроў слова, так і для будучых яго даследчыкаў. Па традыцыі мадэратарам дыялогу выступіла Аліна Эдмундаўна Сабуць. Прадставіла гасцей кіраўнік абласной

пісьменніцкай арганізацыі Людміла Антонаўна Кебіч. Сустрэча прайшла ў фармаце брыфінг-канферэнцыі, – кожны з гасцей адказваў на пытанні аўдыторыі, аргументуючы свае адказы прыкладамі з уласнай творчасці. Вось некаторыя з пытанняў:

- Ваша разуменне творчасці;
- як у Вас адбываецца стварэнне мастацкага вобраза?
- праблема традыцый і наватарства, праблема ўплываў;
- тэматыка творчасці, матывы грамадзянскасці, патрыятызму і інш.





Вопытны педагог А. Э. Сабуць змагла так падрыхтаваць, зарыентаваць студэнтаў, што адказваючы на іх пытанні, кожны з запрошаных творцаў меў магчымасць прадэманстраваць індывідуальнасць свайго творчага патэнцыялу, свой непаўторны аўтарскі почырк, свой шматгранны ўнутраны свет. Прыемна, што некаторых з нас, напрыклад, Людмілу Антонаўну Кебіч *(на фота)* моладзь ведае яшчэ са школьных чытальніцкіх конкурсаў. Вельмі спадзяемся на тое, што скараціць дыстанцыю паміж намі і ўдасканаліць дасведчанасць дапаможа наведванне юнымі філолагамі нашага сайта.

Сёння перад Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ стаіць задача амаладжэння шэрагаў, адкрыцця новых імёнаў, прыцягнення свежых кадраў. Зацікаўлены, патрыятычна выхаваны малады гуманітарый, у сваю чаргу, усведамляе неабходнасць аб'ёмных ведаў, усебаковых прафесійных кампетэнцый, якія ўключаюць і мясцовы матэрыял, і сённяшні дзень айчыннага мастацтва слова. Таму справядліва сказаць, што «Літаратурныя ўніверсітэты» маюць для нас узаемную карысць. А той факт, што вывучэнне творчасці сучасных пісьменнікаў Прынёмання абмяжоўваецца эпізадычным знаёмствам, носіць грамадскі, факультатыўны характар, мяркуем, – з'ява

часовая. Перамяшчэнню са старонак аўтарскіх кніг на старонкі падручнікаў павінен папярэднічаць этап першаснага знаёмства, які мы зараз праходзім. Узяты намі курс на збліжэнне з вышэйшай школай выглядае ўсё больш мэтанакіраваным, каштоўным і лагічным.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** на філалагічным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы адбываецца чарговая творчая сустрэча з гродзенскімі літаратарамі ў межах адукацыйна-асветніцкага праекта педагога, літаратуразнаўцы, члена СПБ Аліны Сабуць пад назвай «Літаратурныя ўніверсітэты». 20 лістапада 2023 года.

***Фота*** Аліны Сабуць













www.pisateli.by